PolotskSU



**УДК 882.6.09**

# СІМВАЛІЧНАЯ ПРАСТОРА ПАЭЗІІ ВІКТАРА ШНІПА

***канд. філал. навук, дац. Н.Б. ЛЫСОВА***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*У цэнтры даследавання – аналіз сімволікі твораў Віктара Шніпа (двух зборнікаў «Балада камянёў» і «Страла кахання, любові крыж») з пункту гледжання іх суб'ектыўнасці, асаблівасцей аўтарскай паэтыкі. У выніку даследавання гаворыцца аб пачуццёвай біяграфічнасці тэкстаў, засяроджанасці В. Шніпа на асабістай і патрыятычнай тэмах, выкарыстанні пісьменнікам кантрастных сімвалаў і стылістык.*

*Сімвалічная прастора паэзіі Віктара Шніпа ляжыць у каардынатах асабістага лёсу аўтара, які скіраваны да смерці і поўніцца толькі ідэальным пачуццёвым зместам. Сімвалічная прастора паэта як самадастатковая сістэма. Самадастатковасць яе – у асобе аўтара. Сістэма гэта створана метадам інтэрпрытацыі універсальных сімвалаў, сваім тлумачэннем іх пры дапамозе кантрастных сімвалаў, праз эмацыянальна-самотнае, псіхалагічна-бязвыхаднае разуменне сучаснасці.*

**Уводзіны.** Выкарыстанне сімволікі – неад'емная рыса паэтычнай мовы. Можна назіраць колькасны масіў статыстычнага аналізу выкарыстання колеравай, фларыстычнай, жывёльнай і іншай сімволікі ў беларускай паэзіі. Але шматзначная прырода сімвала робіць гэтыя аналізы незавершанымі, ці недакладнымі. Сімвал – гэта самастойнае, суб'ектыўнае, вынаходніцтва рэальнасці паэтам, аўтарам. Тэзіс аб універсальным выкарыстанні сімвалу ў творчасці – дыскусійны. Яго прырода суб'ектыўна на столькі, наколькі сімвал фіксуе індывідуальную магчымасць адлюстроўваць матэрыяльнае, цялеснае, пачуццёвае ў ідэальным. Менавіта праз аналіз мэтаў выкарыстання таго ці іншага сімвала, увядзення яго ў той ці іншы кантэкст можна назіраць індывідуальнасць творцы (часцей чуеш наадварот, выкарыстанне сімвала як далучэнне да агульнага, універсальнага). «Дагарала свечачка...» Алеся Петрашкевіча і «Свеча горела...» Барыса Пастэрнака – супрацьлеглыя сімвалы-назвы твораў пры наяўнасці «свячы» як агульнае і канкрэтнае, як народнае і інтымнае, як неба і зямля. Гэта асабліва характэрна для сучаснай паэзіі, якая схільна да інтэлектуалізацыі і суб'ектывізацыі свайго паэтычнага свету, якая адмяжоўваецца ад стэрэатыпнага, масавага ўспрыняцця рэальнасці і ад чытача, які ўспрымае жыццё падобным чынам.

Віктар Шніп – паэт, які не хоча размаўляць з чытачом. У яго ёсць верш з назваю-першым радком «Пра што мае вершы?…», які выразна гаворыць аб гэтым:

Я Богу пра вершы свае адкажу,
Я Богу за вершы свае адкажу,
А вам не скажу,
А вам не скажу… [1, с. 310].

І гэта не малітоўная паэзія, не традыцыйныя біблейскія алюзіі. Гэта паэзія, дзе біблейскія назовы выкарыстоўваюцца таксама дзеля стварэння асабістай паэтычнай прасторы. Той напрамак літаратуры, які гаворыць пра Бога «всуе», дзеля асабістых паэтычных канструкцый.

Мы паспрабуем сцвердзіць вышэйвыказаную тэзу аналізам паэзіі Віктара Шніпа, а дакладней, тэкстаў зборнікаў «Балада камянёў» і «Страла кахання, любові крыж». Ужо ў назвах зборнікаў мы бачым выкарыстанне традыцыйнай сімволікі. Страла кахання, якую выпускаў яшчэ антычны Амур дзеля інтымных прызнанняў. А «любові крыж» – ці «мукі любові», ці страсці Хрыстовы... Сэнс назваў раскрываецца зусім інакш пасля чытання твораў, першапачатковыя тлумачэнні саступаюць месца іншаму вызначэнню: Айчына – гэта камяні, рэшткі зніклага Храма, і мы да яго, як да смерці, ідзем, верым у ідэалы мінуўшчыны, кахаем памерлыя вобразы.

**Асноўная частка.** Віктар Шніп – прызнаны майстра паэтычнага слова, аўтар шматлікіх зборнікаў. Але характарыстыкі яго паэзіі розныя ці не дастаткова пэўныя. Так, А. Бельскі заўважыў у яго творчасці «блатныя» вершы і «дваровыя» балады ды рамансы [2, с. 203]. А У. Гніламёдаў заўважыў у баладах Шніпа «рысы барока – спалучэнне высокага і нізкага» [3, с. 7]. Шніпа называюць і традыцыйным беларускім паэтам (пэўна з-за арыентацыі на гістарычную, патрыятычную, грамадзянскую тэматыку). Але адначасова крытыка падкрэслівае здольнасць паэта да «сімвалатварэння» – «вобразны свет В. Шніпа наскрозь сімвалічны» [3, с. 7]. А гэта – ужо разанаўскі, не традыцыйны, напрамак беларускай паэзіі, за якім – філасофскае рэфлексійнае пранікненне ў рэчы, істоты... У адрозненні ад Алеся Разанава, сімвалічная прастора Віктара Шніпа абмежавана асабістымі прыхільнасцямі, памяццю, лёсам. Гэта – сімвалічна-асабовая лірыка, бо за сімваламі паэта не аб'ектыўны погляд, а падкрэслена свавольны, нават іншы раз хуліганскі (ці дваровы) погляд на рэальнасць. «Шніпаўкі» – хуліганскія кпінкі можна сустрэць нават ў грамадзянскай лірыцы Шніпа. Калі Якуб Колас стварыў паэтычную энцыклапедыю беларускіх раслін, звяроў, птушак, рэчаў побыту, Алесь Разанаў склаў сімвалічны, асацыятыўны паэтычны слоўнік беларускай ментальнасці. Віктар Шніп мае сваю версію паэтычнага вобразнага захавання беларускасці – цыкл «Мая Альфабэта». Тут асобныя беларускія словы робяцца знакамі і сімваламі аднаго і таго ж – яго, беларускага аўтара, паэзіі. Так, на літаратуру «Б» паэт узгадвае: Біблію, Бога, Бацькаўшчыну, бязмежжа, Беларусь і... брухатага балбеса,

PolotskSU



балбатню, безуладдзе... Паэт стварае родныя вобразы на кантрасце, на антытэзах. Нездарма ён называе адзін з раздзелаў кнігі «Белае і чорнае».

У паэта, які стварыў у свой час цыкл «пра сабак», алегарычныя абразкі ў звыш палітычна абвостраны час перабудовы, героямі якіх сталі натуральны амёбны Сабака і занадта актыўны Граждан, у іншы час у грамадзянскай праграмнай лірыцы можам сустрэць:

С гэта сабака
які шукае сэнс
на скрыжаванні скразнякоў
скуголячы па страчаным скарбе [1, с. 266],

а далей – рамантычна-гулліва:

С гэта сэрца сакавіка
дзе я з сімпатычнай сяброўкай
сустракаю світанне [1, с. 266].

Калі яднаецца гульня і шчырасць – атрымліваецца:

Э любіць эротыку
яно эмігрыруе ў само сябе
яно энергічнае
яно эгаістычнае
і кажа мне эх ты [1, с. 269].

Дарэчы, у нізцы вершаў пад назваю «Дом» зноў сустракаемся з вобразам сабакі, які ўжо блізкі да традыцыйна міфалагічнага разумення – як сімвала памерлых, таму што паяднаны з тэмай цемры і смерці:

… цемра заўсёды пільнуе нас
І як сабака віжуе за намі
        пранікаючы ў нас як атрута...
цемра гэта кроў д’ябла
у якой мы як матылі праз агонь
пралятаем праз сэрцы цемры
праз Смерць
цемра гэта вечнасць
у якой нам быць
але толькі цемрай
як альфа і амега [1, с. 91].

Былая сабачая рэальнасць як рэальнасць палітычнай своры, натоўпу, здаецца, сёння набывае абрысы страшнай смяротнай цемры, ад якой паэт хаваецца ў вершах. Ён – Паэт.

Сімвалы Шніпа – знакі асабістага жыцця, што набываюць сімвалічны сэнс пасля іх перажывання, сутыкнення з імі лірычнага героя. Яго паэзія аўтабіяграфічная, як біяграфія душы. Віктар Шніп у паэтычным пафасе гаворыць, што піша не для чытача, але апошні (чытач) з вершаў паэта дазнаецца аб асаблівасцях вясковага дзяцінства, юначых марах, савецкай і пастсавецкай біяграфіі, інтымных схільнасцях, нават пра характар паэта-аўтара. З сімвалічнай прасторы паэзіі Шніпа паўстае самотны лірычны герой, які імкнецца збудаваць свой Храм. Тэма Храма – скразная тэма двух зборнікаў. Адзін з раздзелаў кнігі «Балада камянёў» так і называецца «Дарога да храма. Аповесць у празаічных мініяцюрах і вершах».

Шніп – адзін з тых пісьменнікаў, хто звяртаецца да рэлігійнай тэмы як сімвалічнага скарбу вобразаў. У беларускай сучаснай літаратуры гэта тэндэнцыя вельмі пашырана. Аўтары розных стылістычных напрамкаў апавядаюць пра рэальнасць і свае да яе адносіны з дапамогай рэлігійных вобразаў, сюжэтаў, сімвалаў. Так, напрыклад, Адам Глобус у аўтабіяграфічных мініяцюрах выкарыстоўвае гісторыю пра Каіна і Авеля, калі малюе вобраз сваіх адносінаў з памерлым родным братам («Дом»), а Валянцін Акудовіч абвяшчае свае іранічныя і аналітычныя прыпавесці, эсэ і мініяцюры пра пісьменніка, шчасце, мову, народ і г.д. – «Размовамі з Богам». Назва «Дарога да храма» адпраўляе чытача таксама да вядомай сцэны фільма Т. Абуладзе «Покаяние» часоў перабудовы, калі вуснамі старой жанчыны сцвярджаецца сімвалічнае выслоўе аб тым, што калі дарога не вядзе да храма, дык навошта такая дарога?!

У Віктара Шніпа жа ёсць «Балада храма», дзе храм стаіць над ракой дзяцінства. Ён малюецца як знак жыцця, якое тады ўяўлялася «вечнай ракой»:

«І дарогі да белага Храма
Нас вялі, і не думалі мы,
Што без Храма мы знікнем таксама,
Як без нас пазнікалі дамы,
Дзе жылі нашы казкі і песні,..
… І таму нам вяртацца да Храма,
Што стаіць ля прыціхлай вады,
І маліцца за бацьку і маму
І за нашы ў пустэльні сады…. [1, с. 42].

PolotskSU



«Дарога да Храма» – гэта дарога да малой радзімы. Храм уяўляецца сімвалам дзяцінства, малой радзімы, памяці лірычнага героя. Такая сімвалізацыя паўторыцца і ў новым зборніку «Страла кахання, любові крыж», дзе «нашы магілы» стануць «парэшткамі Храмаў» [4, с. 25], «дзе куст шыпшыны» (класічны літаратурны вобраз Беларусі) будзе «нібы Храм» [4, с. 26].

Паэт расстаўляе на шляху свайго асабістага лёсу рэлігійныя знакі, сімвалы, як «залатыя купалы» і «чорных манахаў» [1, с. 105] ля абгарэлых сценаў загорскіх храмаў, што бачацца яму на прагулцы са «сваёй Людмілай», будучай жонкай [1, с. 106]. Пры гэтым аўтар кпціць з хроснага сына, які раве на руках у царкве – «відаць, камсамольскім важаком будзе» [1, с. 105]. І паэт разумее жыццё як шлях да «свайго крыжа» – смерці. Фіксуе імгненні прыгажосці прыроды, душэўнага спакою..., праз якія прабіваецца Яго святло, «Нібы Хрыстос, што на крыжы…» [1, с. 107]. І зноў вяртаецца да матыву крыжа смерці, да зруйнаванага Храма:

…І шлях назад крыжамі зарастае,
Але вярнуцца хочацца мацней
Да тых сцяжын, дзе мы жыццё любілі,
Нібы цукеркі, што куплялі нам
Матулі нашы, што ў царкву хадзілі,
Нічога не гаворачы бацькам,…
…Ды не вярнуцца больш ніколі нам
Праз лёсу лес, як цемра, непраглядны
У той стары, даўно згарэлы Храм…
«Жыццё, нібыта нітка Арыядны…» [1, с. 107 – 108].

У апошнім вершы, які пачынаецца параўнаннем жыцця з «ніткай Арыядны», спалучаюцца адразу некалькі сімвалічных тэм: тэма Арыядны, што вяла да Мінатаўра каханага; тэма Млечнага Шляху як шляху-сустрэчы закаханых, родных душ; тэма Мінатаўра, сімвала смерці і змагання з ім. Але гэтыя сімвалы, як прывіды, знікаюць, і для лірычнага героя застаецца толькі попел «згарэлага Храма». Безнадзейнасць і самотнасць лірычнага героя будуць пацверджаны яшчэ і яшчэ раз праз вобраз Храма і навакольнага запусцення, вакол такога Храма паўсталі гарады, «дамы, як балоты з павуціннем стагодняй самоты» [1, с. 108].

Такім чынам, выслоўе «шлях да Храма», што стала сімвалам рэлігійнага адраджэння, Віктарам Шніпам выкарыстоўваецца ў іншым сэнсе – гэта не «Храм покаяния», хутчэй каплічка на цвінтары. Таму што тэма Храма прысутнічае разам з тэмай смерці, да якой паэт ставіцца па-асобнаму мудра: усё роднае, гераічнае і высакароднае мінае, а лірычны герой знаходзіцца ў пошуках гэтай велічнай вечнасці.

«Роднае і вечнае» – так назваецца адзін з раздзелаў зборніка «Страла кахання, любові крыж». Але тэме гэтай прысвечана большасць твораў двух зборнікаў, да якіх можна аднесці і «Хату», верша-паэму ці нізку вершаў (жанравыя вызначэнні твораў Шніпа заслугоўваюць асобнай увагі. Тут і вольнае перакладанне класічных жанраў, і свая рытмічная пабудова нізкі вершаў і г.д.) з сімвалічным тлумачэннем падмурку, сценаў, дзвярэй, вокнаў, страхі, гарышча, коімна, падлогі, столі, печы, парога, сенцаў, ганка. Сама схема паэтычнага выкладання тэмы роднай хаты – схема ўспамінаў і развітання (ад падмурка да ганка). А лірычны герой – ужо не жартаўнік, нават не рамантык, а тыповы вясковы мужык, які адчувае сябе на сваёй зямлі, у сваёй хаце. Але вокны хаты зачынены, хата пабудавана вокнамі не на вуліцу, а на двор. Тэма роднай хаты падкрэслена як тэма свайго дому, сям'і, кола: «ў нас ёсць свой падмурак / як карэнне радаводнага дрэва», «замкнутыя дзверы супакойваюць», «вокны зачыняем стаўнямі / нібы хаваемся ў сваё Я» [1, с. 270].

Зборнік «Балада камянёў» пабудаваны так, што за «Хатай» ідуць вершы «Смерць», а потым «Пыл», «Вандроўка...», «Сон», «Снег»... Такім чынам, «роднае» паяднана з «вечным» кампазіцыйна. А ў наступным зборніку «Страла кахання, любові крыж» з'явіцца і раздзел з такой назвай – «Роднае і вечнае».

Пабудова «Смерці», з аднаго боку, адпавядае пабудове верша-паэмы «Хата» – гэта нізка вершаваных сімвалічных тлумачэнняў (на гэты раз васьмі стыхій і выяў (цемры, агню, вады, ветру, дыму, мяча, дзікіх звяроў). Але яна мае свае адрозненні: паэт звяртаецца да гэтах сімвалаў двойчы, у зваротным парадку паўтарае, дапаўняе, папаўняе сімволіку цемры, агню і г. д. У вечнасці з'яўляюцца свае сімвалічныя параметры: лічбы і цыклічнасць. Смерць ходзіць па коле, і кола гэта звужаецца да асабістага імя: «Я – гэта смерць» [1, с. 279]. Так заканчваецца тэма Смерці.

Цыклічная кампазіцыя дапаўняецца ці ўзмацняецца вершамі, якія пабудаваны праз паўтор асобных радкоў, сімвалаў ці пабудаваны магістральна (падобна магістралу ў вянках санетаў). Напрыклад, пятнаццаты верш «Дарога» ў цыкле «Па дарозе да Храма» (раздзел «Воўчая карона» зборніка «Страла кахання, любові крыж») аб'ядноўвае папярэднія вобразы «акуляраў слёз», «воўчай кароны», «бабінага лета», «крыніцаў», «канюшні», «лесу» «як лёсу», «вялікага каменя як Вялікага княства Літоўскага», «аблокаў», «Ляснога дзеда» пад «дубам», «вулля» і «пчалінай маткі», «травы» «на беразе Леты» [4, с. 260].

Акрэсленая вышэй сімвалічная схема паўтараецца і ў іншых цыклах. Сімвалы падпарадкоўваюцца гэтай паэтычнай логіцы. Так, у цыкле «Камяні» таксама фіксуюцца знакі, сімвалы жыцця лірычнага героя. І «камяні дзяцінства» становяцца знакамі магільных пліт, неба, боскага цуда, «камянёў няверуючых» і храма, якога няма на зямлі:

…У той свет не забраць нам палацаў,
Наша слова нас перажыве,
Не забудзецца, стане малітвай

PolotskSU



І ажывіць над намі крыжы,
І вадой, быццам небам разлітым,
У траве завіднеюць глыжы,
Што кідалі ў Хрыста, хто не верыў…
І хаджу я між нашых магіл,
На якіх ляжаць пліты, як дзверы
У анёльскі, як Храм, небасхіл… [1, с. 113].

У цыкле «Лес» [1, с. 114 – 119] лес з'яўляецца і раем без Адама і Евы («што засталося ад Адама і Евы»), і Храмам, «у якім не кожны моліцца», і «лесам крыжоў», дзе мы шукаем свае магілы. Нарэшце, лес – «гэта спакуса пайсці і не вярнуцца. / Лес – гэта мы» [1, с. 114]. І ў такім лесе паэт заклікае маліцца, размаўляць з памерлымі, з роднымі...

З тэмай смерці звязаны і знакі зімы, снега, лёду, белага колеру. Яны робяцца сімваламі вечнасці і роднасці, сімваламі таго, «што праходзіць» і «ў небе, нібы ў лёдзе, / Зоркамі халоднымі гарыць…» [4, с. 24]. Сімваламі зыходячага часу, які «праз нас, як праз пясок вада, / Працёк, застыўшы лёдам на вадзе…» [4, с. 27], але якія арыентаваны на родныя ўспаміны. «Белая дарога» робіцца самай чыстай, самай дарагой: «Нічога не паўторыцца, нічога… / І ў белым снезе белая дарога / Нібы малітва, што ляціць да Бога, / Нібыта Храм, што збудаваны з лёду, / Растане, не адновіцца ніколі» [4, с. 23]. Апошні цытаваны радок «у белым снезе белая дарога» анафарычна паўторыцца яшчэ раз у вершы, быццам рэха ці самае галоўнае для паэта.

Лірычныя, пейзажныя замалёўкі робяцца знакамі д'ябла («з неба сыплецца, / Сыплецца снег, Нібы д'яблавы смех... »). Існаванне героя – падобна плаванню на ладдзе Харона («І ў тралейбусе едзем, нібыта плывём / У жалезным чаўне, дзе нябачны Харон / Нас вязе між слупоў, як антычных калон»). І толькі ўспаміны асвятляюць сумны верш або вобразы маці, жанчыны («І мне хочацца выйсці і следам ісці / За жанчынай, што ведае сэнс у жыцці») [4, с. 113 – 114]. Толькі вобразы родных і мінуўшчыны могуць пераўтварыць «човен Харона» ў «Ноеў каўчэг». Напрыклад, калі аўтар бачыць, як на роднай зямлі «святляеюць бярозы, / Нібы Ноеў каўчэг, нібы наша царква, / Да якой мне ісці, бы ў дзяцінства вяртацца...» [4, с. 22], ці ўзгадвае «дарогу дамоў, як на Ноеў каўчэг» [4, с. 34]. Сутнасць шніпаўскага «каўчэга» – не выратаванне, а напамін, бо Яго каўчэг, як «старэнькая царква / Пераплыве Еўропу, як акоп / І следам зашуміць палын-трава...» [4, с. 26].

У беларускай літаратуры існуе класічны вобраз ладдзі смерці, звязаны з творам «Ладдзя роспачы» У. Караткевіча. Дзейсна, барочны вобраз, у якім паяднаны прага поўнага жыцця і разуменне існавання вышэйшага суда, у якім ёсць надзея на лепшае, чыстае жыццё маладосці і прыгажосці. Вядома, В. Шніп адштурхоўваецца ад гэтага класічнага вобраза, але стварае свой безвыходны, безнадзейны шлях да смерці. І ратавальная жаночая тэма як тэма кахання гучыць у паэзіі Шніпа як напамін аб родным, аб ідэальным, існуючым па-за рэальнасцю.

У зборніку «Страла кахання, любові крыж» ёсць некалькі аповесцей пра каханне, «аповесцей у мініяцюрах і вершах». Яны рамантызаваныя, імітаваныя пад маладзёжныя непрафесійныя дзённікавыя прызнанні і здаюцца штучнымі сярод іншых інтэлектуальных тэкстаў. На прыкладзе адной з іх паспрабуем усё ж такі расшыфраваць сэнс гэткіх падобных любоўных вершаў. Аповесць «Першы папяровы снег» быццам бы перададзеная паэту мастаком, што шчыра даверыў паперы свой дзённік-прызнанне ў каханні сустрэтай у цягніку незнаёмцы. Умоўна абмяжоўваючыся ад аўтара тэкстаў, Шніп укладае ў вершы гэтай аповесці свае звычайныя паэтычныя вобразы ў іншы кантэкст. Такія сімвалы, як Бог, Храм, снег, зіма, смерць і інш., канцэнтруюцца вакол жаночага вобраза, у якога няма імя, але ёсць назва – Цудоўная і Непаўторная. Словамі безнадзейна закаханага мастака аўтар развітваецца не толькі з прывідам-вобразам, але і з жыццём, са сваім часам, з Беларуссю. Зноў канкрэтная жанчына набывае рысы радзімы, як некалі Людміла параўновалася з Рагнедай, а маці станавілася «нашай мамай» [1, с. 108] ці нават Хрыстом: «Як жыццё, наш канчаецца дзень / І за ўсіх нас зноў моліцца мама / І наперадзе нас уся ў белым ідзе…» [4, с. 38].

**Заключэнне.** Сімвалічная прастора паэзіі Віктара Шніпа, такім чынам, ляжыць у каардынатах асабістага лёсу аўтара, які скіраваны да смерці і поўніцца толькі ідэальным пачуццёвым зместам. Сімвалічная прастора паэта як самадастатковая сістэма. Самадастатковасць яе – у асобе аўтара. Сістэма гэта створана метадам інтэрпрытацыі універсальных сімвалаў, сваім тлумачэннем іх пры дапамозе кантрастных сімвалаў, праз эмацыянальна-самотнае, псіхалагічна-бязвыхаднае разуменне сучаснасці: «З надзеяю на лепшыя часы / Гляджу ў туман … дзе сцежка, як прамень, / Як пад жыццём маім самотным рыса…» [4, с. 28].

ЛІТАРАТУРА

1. Шніп, В.А. Балада камянёў: паэзія і проза / В.А. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 318 с.
2. Бельскі, А.І. Беларуская літаратура XX стагоддзя: гісторыя і сучаснасць / А.І. Бельскі. – Мінск: Аверсэв, 2005. – 271 с.
3. Гніламёдаў, У.В. Калі ты паэт. Прадмова / У.В. Гніламёдаў // Страла кахання, любові крыж / В.А. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2008. – С. 5 – 10.
4. Шніп, В.А. Страла кахання, любові крыж / В.А. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2008. – 270 с.

*Паступіў 16.04.2008*